# Гудойць Іосіф Вайцехавіч



**Іосіф Вайцехавіч ГУДОЙЦЬ нарадзіўся на Астравеччыне.**

На вайну прызваны пасля вызвалення Беларусі: у 1944 годзе. Быў сувязістам у пяхоце.

*“<…>. Сувязісты ўжо амаль заканчвалі сваю аперацыю, як грымнулі адзін за адным выбухі, – немцы іх заўважылі і пачалі абстрэл. Іосіф Вайцехавіч бачыў, як упаў, нібы падкошаны, таварыш збоку, яшчэ адзін ззаду, яшчэ і… востры боль нібы гарачым жалезам апёк правую нагу. Ён тут жа страціў прытомнасць.*

*Апрытомнеў ужо ў шпіталі. Нага па-ранейшаму балела, хоць, як аказалася, амаль да калена яе ўжо не было. <…>”. (З артыкула Г.Францкевіч, “Астравецкая праўда”, №35, 1995г.)*

У лютым 1945 года атрымаў цяжкае раненне правай нагі – застаўся інвалідам. Дзень Перамогі сустрэў у шпіталі пад Варшавай.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі “За вызваленне Варшавы”, “За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945гг.”.

Жыў у в. Сакалойці Астравецкага раёна. Працаваў рахункаводам-касірам, старшынёй сельсавета, намеснікам старшыні калгаса, загадчыкам вытворчага ўчастка, адказным за тэхніку бяспекі.

https://www.ostrovets.by/news/novosti/news57785.html